

# Мяцельская Таццяна Міхайлаўна,

**намеснік дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце**

## Восень

Восень косы распусціла,
І павісла павуцінне
На ажынавым кусце,
У сарокі на хвасце.

Вецер з дрэў лісты зрывае,
Імі сцежкі засцілае.
Быццам посцілку стракатую
Кожны дзень старанна латае.

Хмары сонца закрываюць,
З неба дожджык пасылаюць.
Ён то льецца, то імжыць.
Зайка пад кустом дрыжыць.

Зайку лета ноччу сніцца:
пад сасной трава-кісліца.
Не было бяды і ліха –
Побач маці з ім зайчыха.

– Дзе ж ты, летняя пара?
– Дзе ж ты, цёплая нара?
– Дзе схавацца мне зімою?
Ходзіць сцежкай воўк з лісою.

Супакойвае вавёрка:
–Ты чаму так плачаш горка?
Будзе холад і завея –
Тваё футра пабялее.

Дабаўляе тут сарока:
–Хоць зіма і недалека,
Але ж скончыцца яна,
прыйдзе зноў да нас вясна.

**Зіма**

Зіма прынесла холад, сцюжу.
Ільдом скавала рэчкі, лужы.
Укрыла снегам луг і поле,
Як срэбра, ззяе наваколле.

У лесе спяць мядзведзь і вожык,
Іх саграваае цёплы ложак.
У дупле схавалася вавёрка,
Бяляк стаіўся за пагоркам.

Сініцы, вераб'і, аўсянкі
На грушы селі каля ганку.
Чакаюць, калі гаспадыня
Зярнятак жменю курам кіне.

Кусты і дрэвы ў шапках белых
На сонца зіркаюць нясмела:
Тваё дзе, сонейка, цяпло?
Увесь лес снегам замяло.

Халодны вецер рэжа вочы,
У коміне гудзе ўночы.
Зіма злуецца і лютуе,
І замкі белыя будуе.

**Дзе б ты не быў**

Дзе б ты не быў, у якой краіне.
Куды б не кінула цябе.
Аб доме памяць не загіне.
Сцяжынка зноў туды вядзе.

Як толькі ноч уладарыць стане,
І галаву я прыхіну,
Шчаслівая пара настане-
Я ў дзяцінства загляну.

Вось наша вуліца ля краю
Дарогі, што ў лес вядзе.
Сябе маленькую ўбачу
Я ў дзіцячай грамадзе.

Вось з братам, узяўшыся за рукі,
У грыбы  спяшаемся з кашом.
Там пад бярозкамі малымі
Баравікоў тугіх плятнём.

Я бачу поле з васількамі,
Дарогу з жоўценькім пяском,
Ступалі босымі нагамі,
Дамоў шагаючы ляском.

Я помню кладку на канаве,
Як ногі слізгалі па ёй,
Калі бялізну паласкалі
Сцюдзёнай, чыстаю вадой.

У сне калодзеж бачу часта,
А побач клён нам дорыць цень.
Карову доіць цётка Наста.
Я там гуляла кожны лзень.

На лавачцы ля сваёй хаты
Бабуля сумная  сядзіць.

Я зноў у нечым вінавата-
З дакорам на мяне глядзіць.

Яшчэ мне часта школа сніцца:
Мой самы першы ў жыцці клас.
У сне баюся памыліцца
І даць няправільны адказ.

На вуліцы ля самай школы
Бярозка стройная шуміць.
А побач клуб-людзей наўкола.
У клубе музыка грыміць.

Вось тут прайшло маё дзяцінства-
Жыцця шчаслівая пара.
І сэрца пачынае біцца,
Як падыходжу да двара.

Тут люба кожная травінка,
Тут сэрца  і  душа мая.
Мне ветрык шэпча ў галінках:
У Прусах ты заўжды свая.

Дзе б ты не быў, дзе б не прыбіўся.
Куды б не кінула цябе.
У свой родны дом, дзе нарадзіўся,
Прыходзь не толькі ты ў сне.